сожалению, история взаимоотношений между Церковью и государством недостаточно изучена [1]. Не являлись исключением и работы белорусских историков по освещению взаимоотношений Церкви и советской власти в БССР [2}. Объясняется это в первую очередь полным игнорированием церковной проблематики советскими исследователями как неактуальной, а также тем, что долгие годы многие документы хранились в секретных архивах [3]. В работах же исследователей, посвященных социалистическим преобразованиям в Западной Беларуси, практически не затрагивались вопросы «атеизации» населения, в частности, формы и методы проведения антирелигиозной агитации и пропаганды.

В условиях западных областей БССР, в проводимой антирелигиозной политики учитывалось их пограничное положение, недавнее сильное влияние духовенства, религиозная приверженность значительной массы населения [4}. Кроме того, был учтен и благоприятный для СССР факт дискриминации польскими властями Православной Церкви [5]. Рискованно для советской власти было и массовое недовольство населения гонениями на Церковь, когда германская армия стояла у самой границы [6]. Поэтому основной формой антирелигиозной пропаганды и агитации в присоединенных западных областях стало систематическое чтение лекций, докладов, проведение бесед на антирелигиозные темы, опирающиеся на достижения современной науки и включающие в себя прославление справедливой политики государства, Сталинской Конституции 1936 года и «свободы совести» в СССР. Несмотря на самоуверенные заявления партийных органов о большой популярности подобных мероприятий [7], ощутимых результатов они не дали. Это и послужило причиной принятия ЦК КП(б)Б Постановления от 10 февраля 1941 года, поставившего задачу более жесткой, агрессивной и непримиримой борьбы с религией во всех ее проявлениях, «шаг за шагом вскрывая ложь и обман церковников, вред религиозной идеологии, ее реакционную сущность» [8].

Таким образом, пропагандистскую антирелигиозную работу советских органов власти в западных областях Беларуси можно условно разделить на два этапа: 1) к. 1939 г. – февраль 1941 г.; 2) февраль – июнь 1941 г. Рубежом между ними стало опубликование Постановления ЦК КП(б)Б от 10 февраля 1941 г. «О состоянии антирелигиозной пропаганды в западных областях БССР», служившее директивой к усилению антирелигиозной борьбы, ужесточению ее методов.

**Литература**

1. Государственный архив Брестской области (далее ГАБО). Ф.6 «П».Оп.1а.Д.1.Л.16.
2. Национальный архив Республики Беларусь. Ф.4.Оп.27.Д.328.
3. Русская Православная Церковь и коммунистическое государство 1917-1941. Документы и фотоматериалы. – М., 1996. – 325 с.
4. Biegun K. Przesladowania kosciola na ziemiach zagarnietych przez ZSRR // Wirz. – Warszawa, 1993. – №9 (419). – S. 119.
5. Вл.Цыпин прот. История Русской Церкви (1917 – 1997). – М., 1997. – С. 238-244.
6. Одинцов М.И. Религиозные организации в СССР: накануне и в годы Великой Отечественной войны. – М., 1995. – С.7.
7. Шкаровский М.В. Русская Православная Церковь при Сталине и Хрущеве (Государственно-церковные отношения в СССР в 1939-1964 годах). – М., 1999. – С. 118.
8. ГАБО. Ф.673.Оп.3.Д.393.Л.78.

## КУЛЬТУРА ЯЗЫЧНІЦТВА І СУЧАСНАСЦЬ

***В. М. Шашок***
Навуковы кіраўнік – ***Т. В. Кедрык***
*Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт*

Сёння ў свеце існуе вялікая колькасць розных рэлігій. На Беларусі асноўнай з'яўляееца хрысціянства, у прыватнасці, праваслаўе. А дванаццаць стагоддзяў таму тут панавала іншая рэлігія, іншая вера. Род, Сварог, Пярун -- усе, напэўна, чулі пра гэтых багоў -- у іх верылі нашыя продкі, а дакладней сказаць, ім верылі. Пазней, як вядома, прыйшло хрысціянства. Але не так проста было ўраз знішчыць шматвяковыя традыцыі старажытнасці. Прынцыпы,

усталяваныя і шчыльна сплеценыя з паўсядзённым жыццём, захоўваліся і ў быце простых сялян, і ў іх свядомасці. Гэтую рэлігію называюць язычніцтвам, або шматбожжам, або, неяк здзекліва, паганствам.

А сімвалы язычніцкай культуры сапраўды вартыя самай пільнай увагі, таму што хаваюць у сябе неверагодна глыбокі і складаны сэнс. Шмат хто чуў пра перавагу белага і чырвонага колераў у адзенні беларусаў, але не надта многа людзей ведае, што, напрыклад, чырвоны колер расшыфроўваюць як сімвал жыццёвага пачатку. Сімволіка агню надзвычай багатая ў беларускай народнай культуры, напрыклад, вядома, што на Палессі знаходзяць хаты з выявамі двух сонцаў (сонца з'яўляецца язычніцкім аналагам агню, у той час, як свечка -- хрысціянскім). Язычніцкія святы, захаваліся і сёння (Купалле, каляды, дзяды, масленіца), і, што цікава, параўнаўшы хрысціянскі каляндар святаў з язычніцкім, выяўляецца, што асноўныя дні святаў супадаюць.

Можна сказаць, што язычніцкая культура ў сучасным яе праяўленні, з усёй яе сімволікай, з багамі, з традыцыямі і абрадамі -- досыць дасканалая сістэма, у якой улічаны і сельска-гаспадарчыя традыцыі, і кліматычная ўмовы мясцовасці, і псіхалагічны фактар чалавека, нават вызначаны спрыяльны час для правядзення вясельных абрадаў. Існуе досыць вядомы вясельны абрад: кідаюць жытнёвае зерне на маладых. Зараз гэта проста сімвал дабрабыту сям'і, а на самой справе гэтым дзеяннем родныя закладваюць пачатак самастойнага жыцця маладых, пачатак іхняй гаспадаркі; вяселле адбываецца ўвесну, і зерне трапляе ў зямлю, прарастае.

З аднаго боку, гэта проста цікавыя звесткі, большасць лічыць усё гэта звычайнамі забабонамі, некаторая даволі ўпэўнена абараняюць пункт гледжання, што язычніцтва і ўсё, што з ім звязана, гэта старонка нашага мінулага, значна ніжэйшага па ўзроўні інтэлектуальнага развіцця за сучаснасць. Але ўсё ж існуюць меркаванні, што шматбожжа і звязаная з ім складаная абрадавая сістэма, яго вобразы, яго сімвалы, яго прынцыпы і традыцыі -- гэта тое, што ніяк нельга забываць, адмаўляць, губляць, тым больш, знішчаць, а трэба выкарыстоўваць мудрасць нашых продкаў, якія, у адрозненне ад нас, разумелі сваю еднасць з прыродай і не прыдумвалі розных спосабаў яе абароны ад сваёй жа дзейнасці, а жылі з ёй у згодзе.

Такім чынам, язычніцкая культура з'яўляецца сэнсава абгрунтаванай сістэмай, таму яе сімвалы дайшлі да сёняшніх дзён і неадрыўна звязаныя з нашым жыццём. Адно толькі шкада, што значэнне гэтых сімвалаў мала хто ведае і яны набываюць дэкаратыўны характар.

## АНТЫЎНІЙНЫЯ ВЫСТУПЛЕННІ ГАРАДСКОГА НАСЕЛЬНІЦТВА БЕЛАРУСІ Ў ПЕРЫЯД УМАЦАВАННЯ УНІЯЦКАЙ ЦАРКВЫ (КАНЕЦ XVI-XVII СТСТ.).

*Л.М. Шэйко*
Навуковы кіраўнік – к.гіст.н. ***І.Э. Яленская***
*Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна*

XVI ст. прынесла шмат перамен у палітычнае і сацыяльна-эканамічнае жыццё ВКЛ. З падпісаннем Берасцейскай уніі быў пакладзены пачатак існаванню новай канфесіі хрысціянскага свету – уніяцтву. Перыяд станаўлення і ўмацавання уніяцкай царквы адрозніваецца насычанасцю і неадназначнасцю падзей, што выклікае асаблівую цікавасць да вывучэння рэлігійнага жыцця к. XVI-XVII стст. і неабходнасць даследаваць праблему стаўлення насельніцтва да уніі. Народжаная на беларускіх землях уніяцкая царква выклікала адказную рэакцыю з боку ўсіх колаў грамадства. Аднак асаблівай актыўнасцю вызначыліся гараджане. Гэта тлумачыцца, па-першае, тым, што яны з'яўляліся адной з найбольш сацыльна актыўных частак тагачаснага грамадства і, у адрозненні ад сялян, мелі не толькі абавязкі, але і правы. Па-другое, гараджане ў меньшай ступені, чым вышэйшыя колы грамадства, былі крануты паланізацыяй. Па-трэцяе, радыкалізацыя антыўнійных настрояў была справакавана тымі гвалтоўнымі метадамі, якія мелі месца ва ўсей палітыцы «станаўлення уніяцкай царквы».

Апазіцыйнасць гараджан праяўлялася ў розных формах – ад пратэстаў і соймавых дэбатаў да рознага роду выступленняў. Спачатку мяшчане спадзяваліся на прыхільнікаў праваслаўя, якія на соймах імкнуліся дасягнуць узаемнай згоды, і на дзейнасць праваслаўных брацтваў. Па меры разгортвання імклівага прымусовага пераводу праваслаўных ва уніяцтва,